Хацкевіч К.К., студ. гр. 514 ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гуцько В.Л.,
кандыдат культуралогіі

# АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ АБРАДУ ГУКАННЯ ВЯСНЫ НА МІНШЧЫНЕ

Святочная-абрадавая культура займае важнае месца ў складзе нацыянальнай культуры. Каляндарныя святы, якія адзначаліся беларусамі, у першую чаргу, неслі светапоглядную аснову, дзякуючы гэтаму можна было растлумачыць і зразумець пэўную сучасную з’яву.

У нашым свеце, дзе пануе глабалізацыя і ўніфікацыя, для любога народа вельмі важна не згубіць сваю нацыянальную ідэнтычнасць. Зварот да духоўных здабыткаў продкаў дазваляе нам глыбей пазнаць іх уяўленні аб навакольным свеце і аб месцы ў ім чалавека.

У сельскай мясцовасці першыя крокі вясны бачны лепш, чым ў горадзе, таму можна меркаваць, што абрад гукання вясны, як і шэраг іншых аграрных абрадаў, лепей захаваўся на вёсцы, але праведзенае апытанне вучняў Пліскай сельскай школы паказвае нам, што свята не з’яўляецца папулярным у дадзенай мясцовасці. Не гледзячы на яго непапулярнасць, месца Гукання вясны нельга пераацаніць у традыцыйным абрадавым коле.

За месяц да правядзення свята “Вясна-красна на ўвесь свет” у Пліскай сярэдняй школе было праведзена апытанне сярод сямідзесяці вучняў 7-9 класаў (12-15 год) на тэму: “Ці знаёма вам свята “Гуканне вясны ?”. Вынікі апытання наступныя:

1. 85% вучняў у першы раз чуюць пра такое свята;
2. 10% вучняў знаёмы з такой назвай;
3. 5% вучняў прыкладна ўяўляюць, які сэнс нясе свята, але дасканала апісаць яго сутнасць не могуць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па выніках апытання можна меркаваць, што правядзенне свята “Вясна-красна на ўвесь свет!” у дадзенай мясцовасці спрыяе набыццю ведаў аб традыцыйнай культуры.

Правядзенне свят традыцыйнай культуры ставіць рэжысёра ў пэўныя рамкі, перш за ўсё гэта звязана з рэгіянальнымі асаблівасцямі святкавання, разгледзім некаторыя з іх характэрныя для Міншчыны.

Благавешчанне выяўляе свой асаблівы характар перш за ўсё ў забароне на працу. Сельскагаспадарчая магія гэтага дня скіравана большай часткай на папярэджанне страт ці нягодаў, і толькі ў асобных выпадках на забеспячэнне ўраджаю. У Слуцкім раёне ладзіліся арэлі. Лічылася, што гушканне на іх забяспечыць вялікі ўраджай лёну.

Прынцыпова важнай забаронай з’яўляліся дзеянні, накіраваныя да раслін, жывёл, птушак. Мэта забарон заключалася ў тым, каб пазбегнуць парушэнне развіцця зародкаў і з’яўленне калек. У Барысаўскім раёне ў гэты дзень “цыплят не садзілі”, бо лічылася, што будуць баўтуны ці калекі.

Паўсюдна на Міншчыне забаранялася ставіць платы, бо гэта магло выклікаць засуху.

Да асноўных павер’яў Благавешчання адносіцца і прылёт бусла. З’яўленне гэтай птушкі гаворыць аб канчатковым адыходзе зімовага холаду. Таксама з буслом звязваюць некаторыя прыкметы, напрыклад: “Птушка гнязда не ўе, а дзеўка касу не пляце”, што паказвае безумоўную забарону на працу пры выключэнні такіх атрыбутаў свята, як багатае застолле і весялосць. Сімволіка птушак у традыцыйнай культуры даволі распаўсюджаная, вобраз бусла ў ёй займае асобнае месца. З ім звязана шмат павер’яў, легенд. Уключэнне такога антрапаморфнага вобраза ў кантэкст свята, робіць яго больш напоўненым сімваламі традыцыйнай абраднасці. У дадзеным сваце бусел вызначаўся як вястун вясны, птушка, якая нясе на сваіх крылах цяпло і шчасце. Нельга забываць, што традыцыйнае стаўленне беларусаў да птушак таксама было звязана з месцам знаходжання душ памёршых продкаў і звязвалася з вы-Раем. Гэта гаворыць аб сувязі птушак са

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звышнатуральным светам, таму ў дадзеным сваце бусел выступаў  і як істота прадказваючая жыццё.

Паўсюднае выпяканне "птушак" і найперш "жаўранкаў" шырока распаўсюджаннае дзеянне прыкмечанае да Гукання вясны, дадзены элемент таксама быў ўключаны ў свята.

У Салігорскім раёне Мінскай вобласці захаваўся абрад "затанцоўвання" вясны. Па структуры ён падобны да калядных і валачобных абыходаў. Моладзь збіралася ў гурт і абыходзіла кожны двор, дзе вадзіла карагод. Гаспадарам зычылі добрага ўраджаю і дабрабыту. Самому карагоду таксама прыпісваліся магічная сіла: па-першае, кола – старажытны сімвал абароны, захаванасці; па-другое, падчас яго выконвалася абрадавая песня-замова: "Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць..."

Ва ўмовах горада, калі людзі прывязаны да абмежаванай прасторы і памяшканняў, святкаванне вясны набывае надзвычай важнае выхаваўчае і аздараўленчае значэнне. Арыентацыя чалавечай душы і розуму на Сонца і Сусвет — элементарная ўмова нармальнага функцыянавання асобы. На жаль, плануючы святы, мы не заўсёды вывяраем яго па гэтым аспекце.

Адным з галоўных элементаў свята "Вясна красна на ўвесь свет!" з'яўлялася "веснавое шэсце". Якое рахулася па усёй тэрыторыі вёскі. Удзельнікі шэсця спявалі веснавыя песні і запрашалі гледачоў на свята. Можна адзначыць, што такі метад актывізацыі аказаўся вельмі эфектыўным і відовішчным.  Кульмінацыйным момантам свята быў вызначаны прыход шэсця да цэнтральнай плошчы.

Па выніках ўвасаблення свята хацелася б даць наступныя агульныя рэкамендацыі па правядзенню свята "Гуканне вясны":

- перш чым вывесці дзяцей і дарослых на прастору прыроды, трэба азнаёміць іх з тэарэтычнымі звесткамі пра традыцыйную культуру;
- рэжысёрам асабліва звяртаць увагу на рэгіянальныя асаблівасці святкавання, пабудову дзей і стварэнне святочнай атмасферы, а таксама на захаванне народнага каларыту свята;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- дамам культуры ўключаць свята “Гукання вясны” у гадавы план праводзін мерапыемстваў;
- педагогам пры выкладанні дысцыплін узгадваць пра свята “Гукання вясны”;
- метадычным цэнтрам трэба праводзіць семінары аб ўдасканаленні ведаў ў галіне традыцыйнай народнай культуры беларусаў;
- праводзіць курсы па ўдасканальванню ведаў аб святах народнай культуры;
- у школьных і пазашкольных установах, неабходна вылучыць час для размоў і факультатываў аб традыцыйнай народнай культуры беларусаў;
- установам культуры, праводзіць маштабныя акцыі з гульнёвымі элементамі.

Толькі пры гэтых умовах свята набудзе новыя яскравыя рысы, напоўнецца нацыянальным каларытам, і стане арганічнай сувяззю чалавека і прыроды.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К.Бандарчык, Л.І. Мінько, Г.І. Каспяровіч і інш. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993.

2. Земляробчы каляндар : Абрады і звычаі / Уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага – 2-е выд., выпр. – Мн. : Бел. навука, 2003. – (Беларуская народная творчасць).

3. Катовіч, А.В. Гуканне вясны / А.В. Катовіч // Веснавыя святы : нарысы : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск, 2005. - Кн. 1. - С. 67-131.

4. Крук, І.І. Следам за сонцам: Бел. нар. каляндар : Дапам. для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мн. : Ураджай, 1998.

5. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў / В.Д. Ліцьвінка. – Мінск : Беларусь, 1997.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ